слабостью в бесконечной «гонке наверх» был, пожалуй, наиболее одиозной фигурой среди ведущих нацистских европеистов. Еще в 1920-е гг. он приступил к философскому обоснованию европейской идеи национал-социализма и на этой основе разработал рекомендации в сфере внешней политики будущего третьего рейха.

Европейская концепция Розенберга исходила из необходимости достижения англо-германской сделки на почве полюбовного раздела мира, причем гитлеровской Германии досталась бы вся Европа, включая СССР, а Великобритании на первых порах гарантировалась бы целостность ее колониальной империи. Однако накануне Второй мировой войны в рейхе возникла еще одна концепция, связанная с именем И. фон Риббентропа. Она покоилась на идее антибританского соглашения Германии, Италии и Японии. Розенберг призывал к антисоветскому походу всех европейских держав (разумеется, под германским руководством). Риббентроп же, учитывая остроту англогерманских противоречий, на первое место ставил борьбу с Великобританией и только после ее поражения полагал обещающим успех нападение на Советский Союз.

Гитлер, принимая во внимание стратегические реалии, сложившиеся в Европе и мире к концу 30-х гг. XX в., начал Вторую мировую войну не по розенберговским рецептам, а в соответствии с предложениями Риббентропа. Курс был взят на серию войн, в ходе которых нацисты намеревались расправиться сначала с Францией и Англией, а затем с СССР и установить на континенте свой «новый порядок». При таких обстоятельствах восточноевропеистские установки «империи» Розенберга подверглись в годы войны известной модификации.

С именем Розенберга, как ни с каким иным в нацистской иерархии, связано формирование философско-теоретического основания национал-социалистического европеизма. Из него вытекала розенберговская политическая концепция «новой Европы», в общих чертах сложившаяся в первой половине 30-х гг. XX в. и предполагавшая заключение англо-германского союза на почве передела мира: во-первых, признания Англией германской монополии в Европе, включая СССР; во-вторых, формального признания целостности британской колониальной империи со стороны рейха. Пока же Европа расчленялась данной схемой на три части. Ее ядро составляла Центральная Европа с Германией во главе, к которой в силу «общности судьбы» обязаны были примкнуть скандинавские и балкано-дунайские страны. Западная Европа, если иметь в виду антисоветский аспект «нового порядка», – потенциальный союзник, а в перспективе – младший партнер Германии. Восточная же Европа, прежде всего СССР, – это, конечно, враг, причем не только нацистского рейха, но и всей европейской культуры. Поэтому борьба с большевизмом провозглашалась Розенбергом первым шагом на пути к «новой Европе», исторической миссией национал-социализма.



**Список использованных источников**


1. *Буханов, В. А.* Гитлеровский «новый порядок» в Европе и его крах, 1939–1945: идейно-политические проблемы / В. А. Буханов; под ред. А. И. Борозняк. – Екатеринбург: Изд-во Урал. ун-та, 1994. – 168 с.

2. *Гитлер, А.* Моя борьба [Электронный ресурс] / А. Гитлер // Политическая библиотека. – 2009. – Режим доступа: http://web.archive.org/web/20070123013917/lib.ru/politolog/ae/putx.txt. – Дата доступа: 17.10.2009.

3. *Гобино, Ж. А. де.* Опыт о неравенстве человеческих рас [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://phao.info/wp-content/uploads/2013/09/Артур-Жозеф-де-Гобино-Опыт-о-неравенстве-человеческих-рас.pdf. – Дата доступа: 16.02.2015.


**(Дата подачи: 19.02.2015 г.)**

*Л. В. Мікалаева*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінск

*L. V. Mikalayeva*
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk

**УДК 930.23(47)**

## АДЛЮСТРАВАННЕ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПЕРЫЯДУ КАНЦА XV – СЯРЭДЗІНЫ XVI ст. У ГІСТАРЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯХ XX ст.

## REFLECTION OF FOREIGN POLICY OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA OF THE PERIOD OF THE END OF XV – OF THE MIDDLE OF THE XVI^th EYELID IN HISTORICAL RESEARCHES OF THE XX CENTURY

*У артыкуле аналізуюцца ключавыя даследаванні знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага канца XV – сярэдзіны XVI ст. айчынных і замежных аўтараў XX ст. Робіцца вывад, што найбольш вывучаным з'яўляецца ўсходні напрамак знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; знешняя палітыка; Вялікае Княства Літоўскае; даследаванне; адносіны; супярэчнасці.*

*The paper analyzes the key studies of foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania late XV^th – mid-XVI^th c., Native and foreign authors of the twentieth century. It is concluded that the most studied is the eastern direction of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania.*

*Key words: historiography; foreign policy; the Grand Duchy of Lithuania; a study relations; contradictions.*

Да нашага часу пакуль няма апублікаваных даследаванняў, дзе б быў прадстаўлены комплексны разгляд праблематыкі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) указанага перыяду, але некаторыя аспекты гэтай тэмы знайшлі асвятленне ў працах па палітычнай гісторыі ВКЛ,

Маскоўскай дзяржавы, Польшчы і г. д. З улікам дастаткова вялікай колькасці такіх публікацый лічым мэтазгодным спыніцца толькі на найбольш значных з іх, у пэўным сэнсе паказальных для свайго часу.

Найбольш вывучанымі аспектамі знешняй палітыкі ВКЛ канца XV – сярэдзіны XVI ст. з'яўляюцца ўзаемаадносіны з Маскоўскай дзяржавай, што не дзіўна, бо яны фактычна аказвалі ўплыў на ўсе астатнія напрамкі вонкавай палітыкі ВКЛ. У шматлікай навуковай літаратуры XX ст., прысвечанай гістарычным лёсам Расіі, Беларусі, Літвы, Украіны, Польшчы, цяжка знайсці працу, у якой не закраналася б у той ці іншай меры барацьба ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай за валоданне памежнымі тэрыторыямі ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. Астатнія ж аспекты знешняй палітыкі закраналіся не вельмі глыбока, магчыма, толькі акрамя адносін з Крымскім ханствам, Польшчай і Лівоніяй.

Вывучэнне гістарычных працэсаў, якія адбываліся ў ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст., пачалося толькі ў 90-я гг. XIX ст., калі ў навуковы зварот пачалі ўводзіць матэрыялы «Метрыкі» ВКЛ, а капітальныя працы М. К. Любаўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, І. І. Лаппо, якія выйшлі на мяжы XIX – XX стст., сталі класікай літуаністыкі.

Вялікую цікавасць для вывучаемай тэмы мае праца М. К. Любаўскага «Литовско-русский сейм», прысвечаная даследаванню гісторыі ўзнікнення, станаўлення і развіцця гэтага дзяржаўна-палітычнага інстытута, высвятленню яго функцый і прэрагатыў, а таксама ўплыву рашэнняў соймаў на ўнутры- і знешнепалітычнае жыццё дзяржавы [1]. Па багацці сабранага ў ёй матэрыялу яна да гэтага часу не мае сабе роўных.

У канцы XIX ст. выйшлі і дзве невялікія працы М. В. Доўнар-Запольскага «Заметки о крымских делах в Метрике Литовской» [2] і «Литовские упоминки татарским ордам. Скарбовая книга Метрики Литовской 1502–1509 гг.» [3]. Першая з іх – сапраўдны вызначальнік па «Метрыцы» ВКЛ для пачынаючага даследчыка па пытаннях адносін ВКЛ з татарскімі ордамі. Другая – падрабязны аналіз скарбавай кнігі «Метрыкі» ВКЛ з вызначэннем агульнага кошту «ўпамінкаў», выплачваемых ліцвінскім бокам у розны час Перакопскай і Нагайскай ордам і ўплыву такіх выплат на агульны стан гаспадаркі краіны.

У пачатку XX ст. праблемы ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ канца XV – сярэдзіны XVI ст. сталі прадметам вывучэння ў манаграфіях польскіх даследчыкаў Ф. Папэ [4], О. Халецкага [5], Л. Фінкеля [6] і інш. Усебаковы аналіз становішча ВКЛ ва ўказаны перыяд, вялікі фактычны матэрыял, пачэрпнуты ў архівах Польшчы і іншых краін, – усё гэта надало высокую навуковую каштоўнасць гэтым працам.

Дасягненні расійскай і замежнай літуаністыкі канца XIX – пачатку XX ст. былі абагульнены ў працы А. Е. Прэснякова «Лекции по русской истории» (апублікаванай толькі праз 30 год – у 1939 г.), якая ўтрымлівала мноства арыгінальных і каштоўных назіранняў [7], і ў «Очерке истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно» М. К. Любаўскага [8].



У той час, як у 1920-я гг. аб'ём літуаністычных даследаванняў на тэрыторыі Савецкай дзяржавы значна скараціўся, а ў 1930–1940-я гг. яны фактычна спыніліся, у Польшчы працягвалі выходзіць артыкулы і кнігі па гісторыі ВКЛ. Прычынай цікавасці польскіх гісторыкаў да праблем міжнародных адносін ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе ў XVI ст. была праводзімая польскімі ўладамі ў часы існавання Другой Рэчы Паспалітай палітыка адраджэння польскай дзяржавы на «Усходзе», мэтай якой была рэалізацыя «ідэі ягелонскай» і «гістарычная місія» Польшчы ва Усходняй Еўропе. У 30–40-я гг. XX ст. у Польшчы выйшаў шэраг прац абагульняючага характару, сярод іх вылучаюцца дзве працы Л. Калянкоўскага, у якіх на вялікім фактычным матэрыяле разглядаліся пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV–XVI ст. [9]. Яго пяру належаў і спецыяльны артыкул, прысвечаны праблеме ўзаемаадносін Ягелонскай манархіі з Крымам [10].

У пасляваеннай савецкай гістарыяграфіі назіралася адраджэнне канкрэтна-гістарычных даследаванняў. Аднавілася і вывучэнне маскоўска-ліцвінскіх адносін XV–XVI стст., а таксама лёсаў славянскіх зямель, што ўваходзілі ў склад ВКЛ. Але ў даследаванні гісторыі ВКЛ у гэты час дамінаваў рэгіянальны падыход, і кожная з рэспублік – Беларусь, Літва, Украіна – цікавілася толькі мінулым сваёй часткі гэтага былога дзяржаўнага ўтварэння. Такі падыход даў і пэўныя станоўчыя вынікі: быў уведзены ў зварот вялікі фактычны матэрыял, з'явіліся манаграфічныя даследаванні, якія прысвячаліся канкрэтным гарадам і землям. Але былі і недахопы. Так, у той час не было створана спецыяльных работ па гісторыі ўсходніх земляў ВКЛ у літоўскі перыяд, бо савецкія гісторыкі цікавіліся іх лёсам толькі з моманту ўваходжання апошніх у склад Маскоўскай дзяржавы[11].

Да таго ж з пачатку 50-х гг. XX ст. у савецкай гістарыяграфіі надоўга зацвердзілася тэндэнцыйная канцэпцыя падзей, якія прывялі да пераходу часткі ўсходніх зямель ВКЛ пад кантроль Масковіі на мяжы XV–XVI стст. Сутнасць яе была ў наступным: славянскае насельніцтва ВКЛ ужо ў XV ст. «пакутавала» ад прыгнёту каталіцызму і «імкнулася» перайсці пад уладу Маскоўскай дзяржавы і на мяжы XV–XVI стст., дзякуючы паспяховай палітыцы маскоўскага кіраўніцтва, «аб'ядналася» нарэшце з адзінавернымі братамі.

Гэта версія ў адносінах да ўсіх славянскіх зямель ВКЛ была прадстаўлена ў манаграфіі К. В. Базілевіча «Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в.» [12]. Але наяўнасць у кнізе К. В. Базілевіча шэрагу недастаткова абгрунтаваных палажэнняў не пазбаўляе яе ў цэлым высокай навуковай каштоўнасці. Яна да нашых дзён застаецца найбольш грунтоўным даследаваннем знешняй палітыкі Маскоўскай дзяржавы пры Іване III (уключаючы ліцвінска-маскоўскія

адносіны, а таксама стасункі абедзвюх дзяржаў з Лівоніяй, Крымскім ханствам, Вялікай Ардой і Малдаўскім княствам).

Пазней з'явіліся новыя даследаванні па гэтай тэме. Так, І. Б. Грэкаў у працы «Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV–XVI вв.» разглядае пытанні ўзаемаадносін паміж краінамі Усходняй Еўропы, у тым ліку ўзаемаадносіны ВКЛ са сваімі суседзямі [13]. Адбітак панаваўшых у савецкай гістарыяграфіі стэрэатыпаў нясе на сабе праца Г. Л. Харашкевіч «Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в.», прысвечаная ўсебаковаму агляду эканамічных, палітычных, культурных сувязяў Маскоўскай дзяржавы азначанага перыяду, закранаючы ў тым ліку і адносіны з ВКЛ [14]. Прычыны і сутнасць маскоўска-ліцвінскіх супярэчнасцяў падрабязна разглядаюцца ў працы А. А. Зіміна «Россия на рубеже XV–XVI столетий» [15]. Узаемаадносіны з Масковіяй у апошнія гады праўлення Аляксандра і часы панавання Жыгімонта Старога, калі пасля смерці Івана ІІІ на маскоўскі вялікакняжацкі пасад узышоў Васіль ІІІ, адлюстраваны ў кнізе гэтага ж аўтара «Россия на пороге нового времени» [16]. У гэты ж час малдаўскія даследчыкі выпусцілі шэраг прац, якія былі прама ці ўскосна прысвечаны асвятленню ліцвінска-малдаўскіх адносін [17]. Але фактычна да канца 80-х гг. XX ст. у савецкай гістарыяграфіі панавала ідэалагічная догма пра векавое непарушнае сяброўства брацкіх славянскіх народаў, паўтараўся тэзіс пра імкненне славянскага насельніцтва ВКЛ да «ўз'яднання» з Маскоўскай дзяржавай, актыўную дапамогу яго маскоўскім войскам. Затое ўсяляк замоўчваўся ўдзел славянскіх народаў у войнах з Масковіяй.

Пачатак 80-х гг. XX ст. быў адзначаны выхадам дысертацыйнага даследавання літоўскага гісторыка Э. Д. Банёніса, прысвечанага вывучэнню праблемы пасольскай службы ВКЛ сярэдзіны XV ст. – 1569 г. [18]. Яго праца стала па сутнасці пачатковым крокам у даследаванні такіх важнейшых пытанняў, маючых непасрэднае дачыненне да знешняй палітыкі, як арганізацыя пасольскай службы і дыпламатыя ВКЛ. Высновы, да якіх прыйшоў аўтар, ішлі ў разрэз з панаваўшым у той час пунктам гледжання, згодна з якім знешняя палітыка і дыпламатыя ВКЛ атаясамлівалася са знешняй палітыкай і дыпламатыяй Польшчы, звязанай з ім персанальнай уніяй. Літоўскі даследчык пераканаўча абверг такое меркаванне, даказаўшы існаванне самастойнага курса ВКЛ у міжнароднай палітыцы і асобнай ад польскай сферы дзейнасці яго дыпламатыі.

Радыкальны перагляд старых поглядаў у савецкай гістарыяграфіі пачаўся ў канцы 80-х гг. XX ст. Новы і якасна адрозны ад ранейшых погляд на ВКЛ і яго адносіны з Маскоўскай дзяржавай знайшоў адлюстраванне ў папулярным нарысе С. В. Думіна «Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское)» [19]. У ім упершыню ў савецкай гістарыяграфіі былі выказаны думкі, якія аспрэчвалі многія стэрэатыпы, у тым ліку ставіўся пад сумненне тэзіс пра прыцягненне славянскага насельніцтва да Масквы, якая, на думку аўтара, разглядалася мясцовым насельніцтвам як адзін з самых злых непрыяцеляў.



Новае стаўленне да праблемы выявілася і ў працах савецкіх малдаўскіх даследчыкаў. Адыход ад старых поглядаў праявіўся ўжо ў тым, што ліцвінска-малдаўскія адносіны пачалі разглядацца не праз прызму польска-малдаўскіх дачыненняў, а як самастойны напрамак [20].

Адносна замежнай гістарыяграфіі пасляваеннага перыяду трэба адзначыць з'яўленне шэрагу прац нямецкіх даследчыкаў. Сярод іх можна вылучыць паказальную ў многіх адносінах, класічную працу Х. Ябланоўскага «Westrussland zwischen Wilnaund Moskau», якая выйшла ў 1955 г. [21]. Твор вызначаецца вельмі грунтоўным вывучэннем грамадства славянскіх зямель ВКЛ. Паставіўшы мэтай даследаваць палітычнае становішча ўсходнеславянскага насельніцтва ў ВКЛ XV ст., аўтар дасканала прааналізаваў беларуска-літоўскія летапісы, паколькі палітычныя тэндэнцыі фіксаваліся найперш у іх. У выніку нямецкі гісторык атрымаў не толькі цэлую шкалу меркаванняў, але і жывую карціну рэлігійных узаемаадносін, і шмат іншых цікавых назіранняў. Вучоны паказаў, што ў тым канкрэтным часе на тэрыторыі так званай Заходняй Русі прамаскоўскай арыентацыі насельніцтва не існавала, што ўзаемаадносіны паміж рознымі канфесіямі, а таксама паміж уладай і праваслаўнай царквой у ВКЛ характарызаваліся талерантнасцю. Такія высновы ішлі ў разрэз з меркаваннямі афіцыйнай савецкай гістарыяграфіяй таго часу.

Адносна польскай гістарыяграфіі трэба заўважыць, што пасля Другой сусветнай вайны, калі Польшча ўвайшла ў сацыялістычны лагер, асаблівасці пасляваеннага міжнароднага становішча ПНР і характар адносін з СССР наклалі адбітак на праблематыку даследаванняў польскіх гісторыкаў. Узаемаадносіны Ягелонаў з Маскоўскай дзяржавай заставаліся ў гэты час па-за рамкамі праблематыкі іх работ. Падвергнуўся крытыцы і тэзіс аб «гістарычнай місіі» Польшчы на Усходзе.

Аднак высокі ўзровень распрацаванасці праблем міжнародных адносін у польскай гістарыяграфіі дазволіў падрыхтаваць шэраг фундаментальных калектыўных прац па гісторыі знешняй палітыкі і дыпламатыі Польшчы. Так, у 1982 г. пад рэдакцыяй М. Біскупа выйшаў першы том «Гісторыі дыпламатыі Польшчы», дзе ўтрымлівалася інфармацыя, што датычылася знешняй палітыкі ВКЛ [22]. Для гэтага выдання, як і для даваенных польскіх даследчыкаў, было характэрна атаясамленне ўсходняй мяжы Польшчы з усходняй мяжой ВКЛ. Пры гэтым адзначалася, што маскоўскія справы з'яўляліся сферай кампетэнцыі канцылярыі ВКЛ, канцлеры княства Мікалай Радзівіл Чорны (1550–1565) і Мікалай Радзівіл Руды (1566–1579) былі праціўнікамі ўніі ВКЛ і Польшчы, і ў час адсутнасці караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста праводзілі самастойную палітыку. Пяру Р. Зялеўскага належаў кароткі нарыс арганізацыі дыпламатычнай службы ВКЛ у першай палове XVI ст., змешчаны ў гэтым жа выданні [23].

Сярод іншых прац польскіх гісторыкаў можна адзначыць даследаванне Ю. Бардаха, які зрабіў спробу разгледзець напружаны характар узаемаадносін ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай скрозь прызму дзейнасці разведвальнай службы Княства [24]. Ваенныя і дыпламатычныя крыніцы XVI ст. утрымліваюць вялікую колькасць падобных сведчанняў, што робіць гэту тэму перспектыўным кірункам для даследавання. У 1976 г. выйшла і сінтэтычная праца М. Космана «Historia Białorusi», у якой былі закрануты пытанні знешняй палітыкі ВКЛ [25].

Геапалітычныя змены ва Усходняй Еўропе ў канцы 80–90-х гг. XX ст. не прайшлі незаўважанымі польскімі даследчыкамі, у працах якіх можна ўжо заўважыць пэўныя змены пры разглядзе праблематыкі, звязанай з гісторыяй ВКЛ. Так, у 1990 г. выйшла 3-е выданне працы Е. Ахманьскага «HistoriaLitwy», у якой знайшлі адлюстраванне новыя падыходы і погляды на пытанні гісторыі ВКЛ, яго міжнароднае становішча і ўзаемаадносіны з Каронай Польскай і Маскоўскай дзяржавай у XVI ст. [26]. Аўтар адзначае, што войны Княства з Масквой з канца XV ст. прымусілі ВКЛ шукаць збліжэнне з Польшчай. Аднак у праўленне Жыгімонта Старога (1506–1548) і Жыгімонта Аўгуста (1548–1572), нягледзячы на персанальную унію, ВКЛ заставалася суверэннай дзяржавай. Цікавыя погляды на знешнюю палітыку ВКЛ часоў Аляксандра Ягелона, пытанні яе ажыццяўлення і кіравання выказаў у сваёй працы К. Пяткевіч [27].

З канца 80-х гг. XX ст. да даследавання праблемы знешняй палітыкі і міжнароднага становішча ВКЛ у канцы XV – сярэдзіне XVI ст. далучыліся і беларускія гісторыкі. Адным з першых быў А. П. Грыцкевіч, у працах якога разглядаліся разнастайныя аспекты міжнароднай палітыкі ВКЛ, у тым ліку адносіны з Маскоўскай дзяржавай, Крымскім ханствам, Польшчай, Святой Рымскай імперыяй і інш. [28]. У адным са сваіх артыкулаў А. П. Грыцкевіч разгорнута і поўна зрабіў апісанне Аршанскай бітвы 1514 г. і яе значэння для лёсу ВКЛ [29]. Гэта стала значным укладам у працэс вяртання з нябыту гэтай бітвы як важнай падзеі знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ і гісторыі ваеннага мастацтва ўсёй Усходняй Еўропы.

Пасля атрымання Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту пачалося больш глыбокае даследаванне пытанняў знешняй палітыкі айчыннымі гісторыкамі, у тым ліку пытанняў узаемаадносін ВКЛ з суседнімі дзяржавамі ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. Наступствам гэтага стала з'яўленне шэрагу артыкулаў, змешчаных у перыядычным друку, навучальных дапаможніках, энцыклапедычных выданнях. Частка з іх мела навукова-папулярны і публіцыстычны характар, але ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст. вырасла колькасць навуковых публікацый. Менавіта артыкулы найбольш шырока прадстаўлены пры рэпрэзентацыі вынікаў даследаванняў беларускіх гісторыкаў па знешняй палітыцы.

З'явіліся ў 1990-х гг. і дысертацыйныя даследаванні, тэматыка якіх звязана з гісторыяй знешняй палітыкі ВКЛ разглядаемага перыяду. Так, у 1997 г. упершыню ў Беларусі У. І. Канановічам была абаронена кандыдацкая дысертацыя па гісторыі дыпламатычных зносін ВКЛ па тэме «Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст.: (Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам)» [30]. Гэта дысертацыйнае даследаванне з'явілася важным крокам у развіцці беларускай гістарыяграфіі гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ, паклаўшы пачатак рэальнаму навуковаму вывучэнню асобных яе праблем.

Абагульняльных прац па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у Беларусі ў 1990-х гг. напісана не было, як не створана і спецыялізаваных энцыклапедый ці бібліяграфічных паказальнікаў. Агульнае асвятленне знешнепалітычнай праблематыкі часоў ВКЛ можна знайсці ў першай частцы выдання «Нарысы гісторыі Беларусі» [31], падрыхтаванага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, а таксама ў шматлікіх універсітэцкіх падручніках і папулярных выданнях.

Такім чынам, розныя аспекты гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ канца XV – сярэдзіны XVI ст. цікавілі даследчыкаў XX ст. Айчынныя і замежныя гісторыкі дэманстравалі самы шырокі дыяпазон меркаванняў па разглядаемай праблематыцы, закранаючы ў навуковых даследаваннях разнастайныя яе пытанні. Але многія старонкі гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ па-ранейшаму яшчэ чакаюць сваіх даследчыкаў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Любавский, М. К.* Литовско-русский сейм: опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства / М. К. Любавский. – М.: Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1900. – 850, 232 с.

2. *Довнар-Запольский, М. В.* Заметки о крымских делах в Метрике Литовской / М. В. Довнар-Запольский. – Б. м., б. д. – 13 с.

3. *Довнар-Запольский, М. В.* Литовские упоминки татарским ордам. Скарбовая книга Метрики Литовской 1502–1509 гг. / М. В. Довнар-Запольский. – Симферополь: Тип. Спиро, 1898. – 91 с.

4. *Papee, F.* Polska i Litwa na przełomie wieków średnich / F. Papee. – Kraków: Gebethner i Wolff, 1904. – T. 1: Ostatynie dwunastolecie Kazimerza Jagiellonczyka. – 422 p.

5. *Halecki, O.* Dzieje Unii Jagiellonskiej / O Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1919. – T. 1. – 482 p.; 1920. – T. 2. – 385 p.

6. *Finkel, L.* Elekcya Zygmunta I. Sprawy dynastyi Jagiellonskiej i unii polsko-litewskiej / L. Finkel. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1910. – VIII, 296 p.

7. *Пресняков, А. Е.* Лекции по русской истории / А. Е. Пресняков. – М.: Соцэкгиз, 1939. – Т. 2, вып. 1. – 248 с.

8. *Любавский, М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государтва до Люблинской унии включительно. С приложением текста хартий, выданных Великому княжеству Литовскому и его областям / М. К. Любавский. – М.: Изд-во Имп. О-ва Ист. и Древн. Рос. при Моск. ун-те, 1910. – II, 376 с.

9. *Kolankowski, L.* Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów / L. Kolankowski. – Warszawa: Scład głowny: kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1. – 475 p.; *Kolankowski, L.* Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne / L. Kolankowski. – Lwów: Scład główny w księgarni Gubrynowicz i syn, 1936. – 374 p.

10. *Kolankowski, L.* Problem Krymu w dziejach Jagiellonów / L. Kolankowski // Kwartalnik Historyczny. – 1939. – T. 49, zeszyt 3. – P. 279–301.

11. *Тихомиров, М. Н.* Россия в XVI столетии / М. Н. Тихомиров. – М.: Изд-во АН СССР, 1962. – 583 с.
12. *Базилевич, К. В.* Внешняя политика Русского централизованного государства: вторая половина XV века / К. В. Базилевич. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1952. – 542 с.
13. *Греков, И. Б.* Очерки по истории международных отношений Восточной Европы XIV–XVI вв. / И. Б. Греков. – М.: Изд-во Вост. лит., 1963. – 374 с.
14. *Хорошкевич, А. Л.* Русское государство в системе международных отношений конца XV – начала XVI в. / А. Л. Хорошкевич. – М.: Наука, 1980. – 293 с.
15. *Зимин, А. А.* Россия на рубеже XV–XVI столетий: очерки социально-политической истории / А. А. Зимин. – М.: Мысль, 1982. – 333 с.
16. *Зимин, А. А.* Россия на пороге нового времени: очерки политической истории России первой трети XVI в. / А. А. Зимин. – М.: Мысль, 1972. – 452 с.
17. *Семенова, Л. Е.* Из истории молдавско-польско-турецких отношений конца XV в. / Л. Е. Семенова // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв./ под ред. Б. А. Рыбакова. – М.: Наука, 1979. – С. 40–52; *Семенова, Л. Е.* Некоторые аспекты международного положения Молдавского княжества во второй половине XV в. / Л. Е. Семенова // Юго-Восточная Европа в средние века: сб. / редкол.: чл.-кор. АН СССР Я. С. Гросул [и др.]. – Кишинев: Штиинца, 1972. – С. 225–234.
18. *Банёнис, Э. Д.* Посольская служба Великого Княжества Литовского (середина XV в. – 1569 г.): автореф. дис. … канд. ист. наук: 00.07.02 / Э. Д. Банёнис; Ин-т истории АН Литвы. – Вильнюс, 1982. – 21 с.
19. *Думин, С. В.* Другая Русь (Великое княжество Литовское и Русское) / С. В. Думин // История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории России IX–XX вв. / сост. С. В. Мироненко. – М.: Политиздат, 1991. – С. 76–126.
20. Очерки внешнеполитической истории Молдавского княжества (последняя треть XIV – начало XIX в.). – Кишинев: Штиинца, 1987. – 464 с; *Параска, П. Ф.* Молдавско-литовские отношения во второй половине XIV–XV в. (опыт ретроспективного анализа источников) / П. Ф. Параска // Проблемы источниковедения истории Молдавии периода феодализма и капитализма. – Кишинев: Штиинца, 1983. – С. 43–61.
21. *Jablonowski, H.* Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Die politische Stellung und die politischen Tendencen der russischen Bevölkerung des Grossfürstentums Litauenim 15. Jh. / H. Jablonowski // Studien zur Geschichte Ost Europas. – Leiden: Brill, 1955. – 167p.
22. Historia dypłomacji Polskiej (połowa X–XX w.): w 5 t. / Polski Institut Spraw Międzynarodowych; pod red. G. Łabudy. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1: Połowa X w. – 1572 / M. Biskup, K. Gorski, Z. Kaczmarczyk, G. Łabuda, Z. N. Nowak, K. Zelewski; pod red. M. Biskupa. – 875 p.
23. *Zelewski, R.* Słuzba dypłomatyczna litewska w zestawieniu z koronną / R. Zelewski // Historia dypłomacji polskiej. – Warszawa: PWN, 1982. – T. 1, cześć 7. – P. 786–788.
24. *Bardach, J.* Ryskun i Spieg (z dziejow służby wywiadawczej w Wielkim Księstwie Litewskim XVI stulecia) / J. Bardach // Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVI wieku / J. Bardach. – Warszawa: PWN,1970. – P. 391–418.
25. *Kosman, M.* Historia Białorusi / M. Kosman. – Wrocław etc.: Ossolineum, 1979. – 425 p.
26. *Ochmański, J.* Historia Litwy / J. Ochmański. – Wrocław etc.: Ossolineum, 1990. – 395 p.
27. *Pietkiewicz, K.* Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku / K. Pietkiewicz. – Poznań: Wyd-wo Naukowe UAM, 1995. – 256 p.
28. *Грыцкевіч, А. П.* Венскі кангрэс 1515 года / А. П. Грыцкевіч // Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1988. – С. 280; *Грыцкевіч, А. П.* Гісторыя геапалітыкі Беларусі / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1994. –№ 1. – С. 85–93; *Грыцкевіч, А. П.* Міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў XV–XVI стст. / А. П. Грыцкевіч // Францыск Скарына і яго час: энцыкл. давед. / БелСЭ. – Мінск: БелСЭ, 1988. – С. 419–420.



29. *Грыцкевіч, А. П.* Бітва пад Оршай 8 верасня 1514 года / А. П. Грыцкевіч // Спадчына. – 1992. – № 6. – С. 2–11.
30. *Кананові, У. І.* Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага ў 1480 – першай чвэрці XVI ст. (адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам): дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / У. І. Кананові. – Мінск, 1997. – 95 л.
31. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / АН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.

**(Дата подачи: 18.02.2015 г.)**

*Р. І. Попель*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск
*R. I. Popel*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94**

## НЕКАТОРЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЎКРАІНСКІХ ЗЕМЛЯЎ XV–XVII СТАГОДДЗЯЎ У ГАЛОЎНЫМ АРХІВЕ СТАРАЖЫТНЫХ АКТАЎ У ВАРШАВЕ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ ПОЛЬШЧЫ

## SOME SOURCES ON HISTORY OF UKRAINIAN LANDS 15th – 17th CENTURIES IN THE CENTRAL ARCHIVES OF HISTORICAL RECORDS IN WARSAW AND IN THE NATIONAL LIBRARY OF POLAND

*У артыкуле разглядаюцца некаторыя крыніцы па гісторыі ўкраінскіх земляў XV–XVII стст., якія захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве і Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы. Гэтыя дакументы могуць быць выкарыстаны ў даследаваннях па гісторыі Украіны, а таксама гісторыі Беларусі і іншых краін Усходняй Еўропы.*
*Ключавыя словы: крыніцы па гісторыі Украіны; гісторыя Украіны; Вялікае Княства Літоўскае; Рэч Паспалітая; Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве; Нацыянальная бібліятэка Польшчы; гісторыя Усходняй Еўропы.*

*In the article the brief review of some primary sources is presented on history of Ukrainian lands of 15th – 17th centuries, kept in the Central Archives of Historical RecordsinWarsaw andinthe National Library of Poland. These documents can be used in research on the history of Ukraine, as well as the history of Belarus and other countries in Eastern Europe.*
*Key words: primary sources on the history of Ukraine; history of Ukraine; Grand Duchy of Lithuania; Polish-Lithuanian Commonwealth; Central Archives of Historical Records in Warsaw; National Library of Poland.*

Украінскія зямлі – Кіеўшчына, Валынь, Усходняе Падолле, Чарнігаўская і Ноўгарад-Северская землі – сталі часткай Вялікага Княства Літоўскага пасля перамог над татарамі і войнаў за галіцка-валынскую спадчыну ў XIV ст. Чарнігаўшчына і Севершчына пасля войнаў першай паловы XV ст. былі далучаны да сваіх валоданняў Маскоўскай дзяржавай, а астатнія ўкраінскія землі ВКЛ у 1569 г. адыйшлі ў склад Польшчы. Галічына і Заходняе Падол-